Ба 216479

III.в.

і л. Б А Р А Ш К А

Отд. III
44353

# 11 ліпеня

МЕНСК БДВ 1930

Ба 216479

Іл. БАРАШКА

# 11 ЛІПЕНЯ

## ДЗЕНЬ ВЫЗВАЛЕНЬНЯ МЕНСКУ АД БЕЛАПАЛЯКАЎ

*ПОПУЛЯРНЫ НАРЫС*

Ш
44353

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА
МЕНСК — 1930

**Зьмест**

Стар.

Прадмова . . . . . . . . . 5
Белапольская окупацыя . . . . . . 7
Дзесятае—адзінаццатае ліпеня . . . . . 19
Вызваленая Беларусь . . . . . . 28
Выкарыстаная літаратура . . . . . . 36

ДЕРЖАВНА ПУБЛІЧНА БІБЛІОТЕКА ОДЕСА
14 ОКТ. 3[illegible]

Заказ № 868. 10.000 экз. (1 1/8 арк.). Галоўлітбел № 2269.

Друкарня Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва.

10. [illegible] 2. 2010

1940
Рэвізія ОДНБ

*Мы ўсе добра памятаем гэтыя дні. Барысаў расстралялі. Бабруйск узарвалі. Менск і другія гарады палілі з усіх бакоў. Усюды яўрэйскія пагромы. Дабро вазамі вывозілі за сабою. Як некалі Нэрон паліў Рым, каб пацешыць сваё мастацкае пачуцьцё, так генэрал Шэптыцкі загадаў паліць Слуцак, у той час, як ён „вялікі заваявальнік", будзе ехаць па шашы на Несьвіж. Гвалты, зьдзекі над кабетамі. „Дымам і пажарам" пускалі паны Беларусь, і гэтым убівалі ў галаву рабочых і сялян яснае разуменьне таго, што пан бароніць толькі сваё і для сябе; калі-ж ён траціць, дык лічыць, што калі ня пану, дык і другім няхай не застаецца. Мы ўсе добра памятаем гэтыя дні і забывацца на іх ня маем права.*

*(З успамінаў тав. А. Чарвякова).*

## Прадмова

Дзесяць год аддаляе нас ад тых часоў, калі Чырвоная армія ў сваім героічным націску на белапольскіх окупантаў вызваліла чырвоную сталіцу Савецкай Беларусі—Менск, вызваліла Савецкую Беларусь. Эпоха, якая аддаляе нас ад памятнага 1920 году па сваёй вялічэзнасьці сьцірае ў памяці працоўных тыя жудасныя, цёмныя дні, якія перажывалі працоўныя Савецкай Беларусі ў 1920 г. Каб цяпер паказаць тое, чым жылі працоўныя ў дні белапольскай окупацыі, каб расказаць аб тым, як Чырвоная армія разам з паўстаўшымі партызанамі вызваляла ад белапалякаў нашу рэспубліку, трэба кожнаму чытачу ўспомніць цяжкое экономічнае становішча Савецкай Беларусі ў той час.

Заняпад народнай гаспадаркі ў нашай краіне паглыбіўся яшчэ больш як першай окупацыяй Беларусі—нямецкай окупацыяй,—так і сьледам за ёй і окупацыяй белапольскай, пад якою Савецкая Беларусь знаходзілася на працягу звыш 11 месяцаў і якая прывяла да яшчэ большага зруйнаваньня гаспадарку нашай краіны.

І цяпер, калі мінае дзесяць год пасьля вызваленьня Савецкай Беларусі ад белапалякаў, калі на месцы зруйнованай краіны павырасталі рабочыя пасёлкі, павырасталі новыя волаты-фабрыкі і заводы, калі магутнае колгаснае будаўніцтва стварае новую соцыялістычную сельскую гаспадарку, калі пролетарыят стварае сваю соцыялістычную культуру,—мы з гонарам можам гаварыць, што рабочая кляса, пад непасрэдным кіраўніцтвам ленінскай партыі, у саюзе з бядняцка-серадняцкім сялянствам, адрадзіла да жыцьця нашу зруйнаваную краіну, накіраваўшы яе разьвіцьцё па правільнаму, соцыялістычнаму рэчышчу.

Кніжка 11 ліпеня не прэтэндуе на паўнату адлюстраваньня тых падзей, у агульнай складанасьці якіх працоўныя Савецкай Беларусі здолелі вызваліць сваю краіну ад белапольскіх окупантаў. Мэта кніжкі больш скромная—расказаць пра тыя падзеі, пра тыя настроі працоўных, якімі жылі мы ў 1920 годзе, як змагалася комуністычная партыя за вызваленьне Савецкай Беларусі, як змагаліся партызаны ў беларускіх лясох пад кіраўніцтвам компартыі, і як Чырвоная армія, у змаганьні з польскімі легіянэрамі, вызваліла Савецкую Беларусь.

Аўтар

## Белапольская окупацыя

Хіба гэта калі забудзецца...
(*А. Вольны.* „Міколка").

Пролетарская рэволюцыя, скінуўшая ўстоі капіталізму ў Расіі, прывёўшая да раўнапраўя працоўных былой Расійскай імпэрыі, у поступе сваім напаткалася на варожыя пролетарыяту сілы з усіх бакоў маладой пролетарскай рэспублікі. Замежныя імпэрыялістыя разам з расійскай белагвардзейшчынай агнявым кальцом пачалі праводзіць змаганьне з маладой Рэспублікай саветаў.

З Усходу наступленьне Калчака, Дэнікін і Урангель на Поўдні, на Украіне, Юдэніч і ангельскія окупанты на Поўначы, а ў нас, на Захадзе, белая Польшча,—не далі адразу маладой пролетарскай рэспубліцы спакойнага існаваньня.

Белая Польшча, абвясьціўшы вайну Савецкай Расіі па загаду Антанты, па загаду ангельскіх і францускіх імпэрыялістых, акупавала Савецкую Беларусь. Нашы расійскія браты не змаглі даць патрэбных сіл для нашага паратунку, бо вораг насядаў з усіх бакоў. Чырвоная армія вясною 1919 г. прымушана пакінуць Заходнюю Беларусь,

19 красавіка 1919 г. белапалякі захапляюць Вільну, а ўлетку 8 жніўня і Менск трапляе ў рукі белапалякаў.

Польскія імпэрыялістыя, аднак, не змаглі прасунуцца далей Бярэзіны. Чырвоная армія спыніла іхнае наступленьне.

Пачалася белапольская окупацыя на Беларусі. Пачаліся рабункі, забойствы, пачаліся гвалты і зьдзекі над насельніцтвам з боку белапалякаў. Польскае камандваньне выдае загад, які руйнуе ўсе заваёвы пролетарыяту, які руйнуе ўсе заваёвы пролетарскай рэволюцыі і аднаўляе прыватную ўласнасьць. Такім чынам, тыя памешчыкі і паны, якія былі вымецены рэволюцыяй з нашых абшараў, пачалі нанова спаганяць свае «правы» на свае маёнткі, страчаныя імі пры савецкай уладзе. Белапольская армія разам з дэфэнзывай паразганяла ўсе грамадзкія організацыі, пазачыняла газэты і школы.

— Нельга было бясьпечна ні прайсьці, ні праехаць па дарогах, сярод белага дня разьдзявалі дагала, ды яшчэ добра было, калі забяруць легіянэры толькі рэчы і грошы, а ня жыцьцё. Але і дома было трывожна: польскія разбойнікі ўрываліся ў мірныя дамы, забіралі апошні скарб і часта на вачох бацькоў гвалтавалі і глуміліся з жанчын,—гаворыць у сваіх успамінах цэлы шэраг таварышоў.

Пачаліся пагромы. Пачаліся панскія зьверствы і пусташэньні. Ужо ў першыя месяцы белаполь-

скага панаваньня турмы былі запоўнены рабочымі і бядняцка-серадняцкім сялянствам. Толькі шляхціц-кулак цешыўся прыходам сваіх «збавіцеляў»— польскіх легіянэраў. У турмах запанавалі самыя бязьлітасныя катаваньні. Бязьлітасна катавалі белапольскія жандары ня толькі членаў нашай слаўнай баявой комуністычнай партыі, але і спачуваючых бальшавізму, і, наогул, каго папала. Зразумела, што ўлада перайшла да паноў, улада перайшла да польскага вайсковага камандваньня. Пад пагрозай сьмертнай кары селянін павінен быў ехаць у абоз, рабочы павінен быў блукаць па пустынных вуліцах, шукаючы чорнай работы ў дамаўласьнікаў.

Прыступіўшы адразу да полёнізацыі краю, белапольскія окупанты ўрадавой мовай зрабілі польскую мову, ня гледзячы на тое, што насельніцтва яе не разумее.

Але ў часы белапольскай окупацыі не ўдалося польскаму жандару спыніць бальшавізацыю рабочых і працоўнага сялянства Беларусі. Амаль ва ўсіх гарадох і мястэчках Беларусі—у Вільні, у Гораднi, у Барысаве, у Бабруйску, у Менску ствараюцца бальшавіцкія падпольныя організацыі. І ня гледзячы на тое, што дзякуючы «стараньням» польскай жандармэрыі адны партыйныя камітэты праваліваюцца, а члены іх кідаюцца ў турмы, на іхным месцы становяцца новыя таварышы і працягваюць сваю бальшавіцкую дзейнасьць, ахапляючы пад свой уплыў усё больш і больш шырокія

масы працоўных, якія з кожным месяцам, з кожным днём выказвалі свае сымпатыі комуністычнай партыі.

Разгон профсаюзаў, заснаваньне так званых «каталіцкіх» профсаюзаў, «юдэйскіх» профсаюзаў, заснаваньне дробна-буржуазнай сыстэмы коопэрацыі нічога не змагло супроцьстаць узрастаючай бальшавізацыі працоўных мас. Кіруючы з падпольля рэволюцыйным рабочым рухам, рухам за вызваленьне Савецкай Беларусі—комуністычная партыя аднаўляе чыннасьць чырвоных профэсыянальных саюзаў, карыстаючыся ў іх вялізным уплывам, праводзячы бязьлітасную барацьбу з соцыял-згоднікамі з дробнабуржуазных партый, як Бунд і інш. Падпольны рабочы рух у гарадох дзякуючы гэтаму набыў, ясна выяўлены, комуністычны характар. Компартыя абудзіла да змаганьня і сялянства. Адзін за адным узьнікаюць партызанскія атрады. Організацыя партызанскіх атрадаў ідзе пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі. Асноўнае ядро партызанскага руху—бядняцка-батрацкія масы вёскі. У партызанскім руху вялікі ўдзел прымалі таксама і рабочыя і сяляне-серадзнякі. Цэлыя вёскі, цэлыя сем'і ідуць партызаніць, ідуць у лес змагацца з белапалякамі. Актывізацыі сялянства да барацьбы з белапалякамі спрыялі непамерныя падаткі, зьдзекі польскіх легіянэраў над бязброй-най моладзьдзю, падпал вёсак за невыкананьне загадаў польскага ўраду.

Забарона-ж забастовак, бязьлітасная расправа з забастоўшчыкамі, актывізавалі шырокія рабочыя масы гарадоў Беларусі на змаганьне з белапалякамі.

Вялікую ролю ў партызанскім руху мела моладзь, і Ленінскі комсамол Беларусі. Шырока разгортваюць сваю дзейнасьць партызанскія атрады на Случчыне пры актыўным удзеле слуцкіх комсамольцаў. Гісторыя ведае цэлы шэраг імён слуцкіх комсамольцаў, расстрэляных белапалякамі за ўдзел у партызанскім руху. Шырока разгарнулася дзейнасьць партызанскіх атрадаў і ў раёне Менску. Партызанскія атрады налічваліся соткамі. Вакол Маладэчына дзейнічаў партызанскі атрад з 250 чалавек, ля Чэрвеню партызанскі атрад складаўся з 200 чалавек, ля Менску партызанскі атрад налічваў 400 чалавек, ля Барысаву звыш 200 і г. д. Партызанскія атрады расьлі з кожным днём. Ля Менску, у Камароўскім лесе, знаходзіўся цэнтральны штаб партызанскіх атрадаў, адкуль партызанскія атрады атрымлівалі паказаньні, куды паведамлялі аб сваіх перамогах і труднасьцях. На заклік партызанаў у партызанскія атрады ішла новая сялянская моладзь. Шырока разгарнулася опэрацыйная работа партызанаў. Узрыў мастоў, разбор чыгуначных палотнаў, напады на польскія абозы і пуск пад адкос цэлых польскіх эшалёнаў было звычайнай работай партызанаў.

З асаблівым уздымам выбухнула паўстаньне ўвесну 1920 году. Дымам пускалі партызаны пан-

скія маёнткі, нішчылі вайсковыя часткі белапольскага войска, пamíралі за справу вызваленьня Савецкай Беларусі. Геройства і адвага беларускіх партызан ня мела граніц. Нельга ня прывесьці тут аднаго дакумэнту, які красамоўна пацьвярджае гэтыя словы. Перад намі прысяга аднаго з атрадаў Бабруйскага павету. Вось яна:

«Я, ніжэйпадпісаны, клянуся гонарам вольнага грамадзяніна, што ведаю аб тэй важнасьці ўзятага на сябе абавязку, ад якога залежыць канец нашае барацьбы ў справе вызваленьня пролетарскіх мас, якія зьнемагаюць у цяжкой няволі, і абавязваюся прайсьці выбраны мною цяжкі шлях.

У разуменьні рэволюцыйнага абавязку я гатоў ахвяраваць сябе для дасягненьня мэты вызваленьня і аднаўленьня ў нас савецкай улады, падобна іншым таварышам, перад мною дастойна памёршым у няроўных бойках.

Усякую ўскладзеную на мяне задачу абавязваюся бясспрэчна выконваць ва ўсякі час дня і ночы. Ніякія страты, пераживаньні і страхі ня прымусяць мяне адмовіцца ісьці ўперад і выконваць ускладзенае.

Усё, што ведаю і раблю, і ўсё, што выходзіць ад нас—буду хаваць ад людзей чужых нашай справе, як хаваю сваё вока, ад таварышоў па рабоце нічога не ўтаю, памятаючы, што толькі гэтым агародзім працу нашу і нас саміх ад згубы.

Абавязак, які ўзяў на сябе, лічу правільным, абавязваюся яго памятаць і выканаць.

Невыкананьне чаго-небудзь з данага мною абавязку лічу злачынным, а за здраду яму раблюся ворагам ня толькі таварышом, з якімі працую, але і цалкам усёй клясе пролетараў, і перад імі адказваю галавой. За здраду справе няхай будзе мне агульная зьнявага і сьмерць».

Вось, яна, прысяга, поўная рэволюцыйнага ўздыму і нявыказнага жаданьня вызваліцца ад клясавага ворага.

У падпольным руху прымалі ўдзел таксама і работніцы і сялянкі-батрачкі. Іхны ўдзел зьяўляецца ня меншым, чым удзел моладзі. Сялянкі насілі ежу сваім мужом і сыном у лясы, паведамлялі партызан аб праходзе польскай вайсковай часткі, каб партызаны своечасова маглі сустрэць яе.

Белапольскі ўрад расстрэламі ня ў сілах быў задушыць паўстаньне. У адказ на расстрэл менскіх і бабруйскіх рабочых, у адказ на расстрэл членаў Бабруйскага партыйнага камітэту мы маем страшэнны выбух паўстаньня на Случчыне, мы маем паўстаньне Дукорскіх партызан, мы маем паўстаньне партызанскіх атрадаў Мазыршчыны, якія сьпярша выступалі зрэдка, але якія напасьледак так шырока разгарнулі партызанскі рух, што праезд па Мазыршчыне для легіянэраў стаўся зусім немагчымым. У адказ на паўстаньні партызан белапалякі спалілі мноства вёсак Мазыршчыны. У часе падпалу вёсак белапалякамі партызаны кідаліся ратаваць ад пажару вёскі, адстойваючы свае хаты ад руйнаваньня.

Партызанскі рух быў найбольшым у Менскім раёне. Пад кіраўніцтвам атамана тав. Лютовіча (Шаранговіча), якому партызанская работа была даручана компартыяй, партызанскія атрады наносілі страты польскай арміі, адцягваючы, такім чынам, яе сілы ад барацьбы на фронце з Чырвонай арміяй.

Кіраўніком партызан Бабруйшчыны зьяўляўся тав. Ляўкоў. Пад яго кіраўніцтвам партызаны змагаліся з белапалякамі на Бабруйшчыне, нішчылі панскія маёнткі, дэзорганізоўвалі тыл польскага фронту, уступаючы ў адкрытае змаганьне з польскімі вайсковымі часткамі, якія вельмі часта ў некалькі разоў былі большыя за партызанскія атрады.

Дамо слова таварышу Ляўкову:

«Да канца окупацыі,—піша тав. П. Ляўкоў у сваіх успамінах «Напярэдадні вызваленьня»,—ня было ніводнае вёскі, ніводнага мястэчка, сяла альбо хутара, дзе ня было-б партызан. Адны з іх актыўна выступалі са зброяй у руках, другія хадзілі ў выведку і дастаўлялі патрэбныя весткі, а трэція матэрыяльна дапамагалі першым.

...Вораг бачыў гэта і азьвярэў,—зазначае далей тав. Ляўкоў.—У бясьсільлі ён пасылаў тысячныя карныя аддзелы і чыніў бязьлітасную расправу, паліў вёскі, сотнямі забіваў мірных грамадзян, браў закладнікаў і марыў іх у астрозе».

Героізм партызан быў у тыя часы вялізны.

«Я чуў,—піша т. Ляўкоў,—як адзін стары, бацька партызана, казаў свайму сыну: «Ты ўцякаеш, а твае таварышы паміраюць. Не асьмельвайся рабіць гэтага, бачыш—ідуць палякі, хавайся за рогам гумна і бі іх»... (Словы гэтыя былі сказаны ў той момант, калі на палёх Рудабелкі, пры полымі палаючае вёскі К., партызанскі аддзел змагаўся не на жыцьцё, але на сьмерць і, пакінуўшы забітымі дзевяноста процантаў свайго складу, адступаў... Страціўшы дзевяць дзесятых сваіх байцоў, аддзел з невялікай рэшткай не разваліўся... праз 2-3 тыдні партызаны зноў напоўнілі свае шэрагі і з новай энэргіяй рабілі сваю справу).

«А вось тып партызана, які трапіў у палон: абадраны, зьняможаны, галодны. На нагах замест ботаў—анучы. У правай кішэні абойма патронаў, а ў левай кішэні—печаная бульба. Над ім зьдзекуюцца. Гіронізуючы, афіцэры паказваюць жаўнерам, што бальшавікі змагаюцца за бульбу. Партызан спакойны. Яго ставяць расстрэльваць, а ён кажа: «Іншай узнагароды я не чакаю!» Яго пытаюць: «Ці варта паміраць за печаную бульбу?»—і атрымоўваюць адказ: «Паміраю за свабоду, за рэволюцыю, за савецкую ўладу»! Эфэкт атрымаўся цікавы,—піша т. Ляўкоў.—Партызана расстралялі, але патроны, бульба, свабода, глыбока запалі ў душу страляўшых, і яны аб гэтым пасьля гутарылі, шукалі бальшавіцкае літаратуры, каб чытаць і пазнаваць свабоду».

Такім чынам, як бачыць чытач, партызанская сьвядомасьць рабіла моральны ўплыў і на салдат польскае арміі, якія пад загадам польскай буржуазіі змагаліся з партызанамі, з Чырвонай арміяй.

Тав. Ляўкоў у сваіх кароткіх успамінах гаворыць чытачу і аб тым, як бацькі займалі месца забітых палякамі сыноў і, злучыўшы помсту за сыноў з вызваленьнем ад белапольскай окупацыі, геройчна змагаліся за ўладу Саветаў.

«...стары Сянкевіч, страціўшы сына, заняў яго месца і ганяўся за праходзіўшымі аддзеламі белапалякаў. На дарозе, дзе ён рабіў засады, доўга можна было чуць смурод гніючых панскіх трупаў. Мае партызаны казалі, што ён забіў шмат белапалякаў,—успамінае т. Ляўкоў.—Стрэльбы, адабраныя ў забітых, ён аддаваў партызанам. Я спатыкаўся з гэтым старым і гутарыў з ім. Ён ахвотна апавядаў пра тое, як паляваў з-за кустоў. «І рука, кажа, ня дрыжала, і баязьні я ня ведаў...». Гэткіх герояў было шмат».

«Я меў гонар,—піша тав. Ляўкоў,—на адным з вучасткаў окупаванай Беларусі кіраваць партызанскім рухам, і ўпэўніўся, што беларус, які стагодзьдзямі згінаў сваю сьпіну пад прымусам царскага ўціску, пасьля двух окупацый, ня хоча быць і ня будзе больш наймітам. Пацьвярджаю выказаную праўду партызанскай барацьбой, пакінутымі весткамі: у мой вучастак уваходзіла 20 валасьцей. Ва ўсіх іх былі аддзелы, якія вялі выключна ўзброеную барацьбу. Некаторыя з іх на-

лічвалі да 200 чалавек, былі ў 75, 30 і 15. Навакол гэтых баявых ячэек на ўсіх абшарах былі раскіданы адзінкі, якія дзейнічалі самастойна. Праз іх ажыцьцяўлялася сувязь аддзелаў з насельніцтвам, улічваўся яго настрой, мераўся рэволюцыйны ўздым. Разам усё ўзятае складала ўражаньне, што працуе адзін аддзел, раскінуты на вучастку, і больш таго, па ўсёй Беларусі, які з кожным днём надточваў тыл ворага і рыхтаваў яму благі канец».

У часы самага найбольшага паўстаньня на дапамогу працоўным Савецкай Беларусі прыйшла Чырвоная армія, якая сваім ліпеньскім наступленьнем канчаткова вызваліла паўстаўшых рабочых і сялян Савецкай Беларусі ад белапольскага панаваньня.

Польскія паны і шляхта, па ўказцы Антанты, па ўказцы міжнароднай буржуазіі, усімі спосабамі імкнуліся запанаваць у Беларусі, зрабіўшы яе сваёй бяспраўнай колёніяй. Але, ня гледзячы на тыя мільённыя сродкі, якія давала міжнародная буржуазія белай Польшчы на змаганьне з Саветамі, ня гледзячы на амэрыканскае абмундзіраваньне белапольскіх легіянэраў і францускую высока-гатунковую зброю,—аднадушнае змаганьне, беславутая барацьба рабочых і сялян Савецкай Беларусі, братняя дапамога рабоча-сялянскай Чырвонай арміі вызвалілі Беларусь ад улады паноў і шляхты, далі магчымасьць працоўным Савецкай Беларусі аднавіць сваю незалежнасьць, здабытую



2И728

крывёю рабочых і сялян, далі магчымасьць вольна будаваць сваё жыцьцё.

На савецка-польскім фронце пачалося славутае ліпеньскае наступленьне...

Партызанскія напады ва ўсіх мясцох,—апісвае тыя часы т. Ляўкоў,—і няўдача на фронце не маглі не адбіцца на дысцыпліне белапольскага войска. Яно пахіснулася і паслабела. Жаўнеры ня слухаліся сваіх афіцэраў і дэзэртыравалі па хатах.

Окупацыя падыходзіла да канца. Далёка на фронце грымелі бязупынна гарматы. Чырвоная армія рыхтавалася да наступленьня. Партызаны атрымалі загад—пачынаць.

Ажыло ўсё. Паляцелі пасланцы, пачалі працаваць лазутчыкі (гэтак зваліся людзі, якія выконвалі асабліва цяжкія заданьні ў сэнсе разьведчыкаў).

Загарэліся масты на галоўных гасьцінцах... Парваны правады. Спынена сувязь фронту з тылам... Зьбітымі колёнамі пачалося адступленьне. Партызаны атакуюць абоз паўтараста падвод і адбіваюць яго. Адступаючыя не здаюцца. Іх усіх забіваюць...

Падыходзіць чырвонае войска. Партызаны з радасьцю спатыкаюць яго, далучаюцца да яго організаваных аддзелаў і ідуць у наступленьне... на Варшаву. Беларусь вызвалена».

Ба 216479

## Дзесятае—адзінаццатае ліпеня

А чырвоныя ідуць,
Песьні волі зноў пяюць...
(*М. Чарот.* „Босыя на вогнішчы“).

К вясьне 1920 году працоўныя Савецкай Расіі перамаглі двух значных сваіх ворагаў—Калчака і Дзянікіна. Зусім слушна, што былі перакінуты вайсковай сілы Чырвонай арміі на Заходні фронт, на фронт белапольскі. Трэба сказаць, што белапольскі фронт прасьціраўся даволі на вялікай адлегласьці. Чырвонай арміі неабходна было забраць окупаваны цэнтр Савецкай Украіны—Кіеў; **Чырвонай арміі неабходна было вызваліць і сталіцу Савецкай Беларусі—Менск.**

Напярэдадні ліпеньскага наступленьня сталіца Беларусі—Менск—уяўляў сабою мёртвы горад. На вуліцах гораду можна было вельмі рэдка спаткаць чалавека. Спраўлялі апошні баль толькі белапольскія легіянэры, праводзячы пагромы і рабаўніцтвы. Усё жыхарства Менску хавалася ў скляпох, пазапіралася ў кватэрах, чакаючы рашучага моманту.

Пры актыўным падтрыманьні партызан Чырвоная армія пачала сваё наступленьне. Як зазначае адзін з кіраўнікоў ліпеньскага наступленьня, т. Вітаўт Путна, Заходні фронт меў даволі вялікія ваенныя сілы.

7 ліпеня, ня гледзячы на супраціўленьне белапольскіх войск і даволі значны агонь, вайсковыя часткі Чырвонай арміі перабраліся перадавымі часткамі на правы бераг рэчкі Бярэзіны і паступова пачалі наступаць на палякаў. І ўжо 7 ліпеня палякі па ўсім Заходнім фронце (у раёне Савецкай Беларусі) пачалі ўцякаць.

Дзень 8 ліпеня,—як піша Вітаўт Путна,—прайшоў на перасьледваньне палякоў, якія не маглі аказваць асаблівага супраціўленьня і абмяжоўваліся некаторым агнявым адпорам дробных ар'ергардных адзінак.

І вось тут пачалося тое страшэннае рабаўніцтва, тое страшэннае зьніштажэньне краю, аб якім мы ня можам успамінаць спакойна.

— Гэтыя часткі,—піша Вітаўт Путна,—якія зьбіваліся намі бяз цяжкасьцяй, і адразу, адыходзячы, падпальвалі лясы, якія густою сьценкаю ахоплівалі ўсе шляхі. Было надзвычай цяжка перамагаць стыхію агню ў лесе, праз які праходзіла дарога. Над суцэльнаю сьценкаю лесу, у напрамку на мястэчка Смалявічы, вісела густая заслона дыму ад лясных пажарышч.

8 ліпеня і частку дня 9 ліпеня Чырвоная армія,—піша Вітаўт Путна,—больш змагалася з агнём,

чым з палякамі. І толькі 9 ліпеня пачаўся гарачы бой каля Смалявіч, які закончыўся тым, што палякам, якія панесьлі вялічэзныя страты, усё-ж удалося, пры падтрыманьні бронецягніка, спаліць станцыю Вітгенштэйнская і праскочыць у напрамку на Менск.

Зрабіўшы начны пераход, 27-я дывізія Чырвонай арміі да 11 гадзін раніцы 10 ліпеня аўладала пераправамі на рэчцы Волма і на ўсім вучастку ад Гарадзішча да мястэчка Волма і ўжо, ня трацячы баявой сувязі з ворагам, які пачаў узмацняць ступень супраціўленьня, да вечара 10 ліпеня была каля 12 кілёмэтраў на ўсход ад Менску.

Палякі, загадзя падрыхтаваўшы абарону Менску, пабудаваўшы акопы з драцянымі загародамі, мелі намер выкарыстаць гэтыя ўзмацненьні для ўпартай абароны Менску. Палякам быў патрэбен час для эвакуацыі Менску і для падмацаваньня. З другога боку, 27-я дывізія Чырвонай арміі сваім шпаркім наступам так выдалася наперад, што ўсе астатнія часткі апынуліся далёка ад яе, на ўсходзе. І вось тут перад камандваньнем дывізіі паўстала пытаньне, альбо чакаць падмацаваньня, альбо атакаваць...

А ў гэты час у Менску ішла шпаркая эвакуацыя. Мясцовая буржуазія, штабы польскага вайсковага камандваньня і ўстановы не пасьпявалі нагружаць маемасьць, якую вывозілі з Менску, з Беларусі.

У Менску быў чутны першы гул гармат. Пад вечар 10 ліпеня прагучэў першы гарматны стрэл

з бальшавіцкага бронецягніка, які даў знаць гораду, што—мы, бальшавікі, ідзем. У гэты-ж час у цэнтры Менску адбывалася страшэнная рабаўніцтва. Польскія жаўнеры ламалі крамы, урываліся ў кватэры і забіралі ўсё патрэбнае і непатрэбнае.

Вось абразкі таго часу:

— Янак, давай тваю стрэльбу... О так, так... падкладвай тутэй... цо тутэй за магазын... побач шыльдэн... мувіш, вшыстко рувно... а цо... загармайстр... я юж...одэрвал...

Гэта грабежніцтва. Польскія жаўнеры ломяць крамы з мэтай знайсьці пажыву.

Вінтоўка зрабіла сваю справу і тут. Узятая на перавес, сталася яна ў руках жаўнераў ломам.

Зазьвінела. Гэта крышыцца вітрыннае шкло. Адзін за адным лезуць жаўнеры ў магазын праз акно і праз некалькі хвілін вылазяць тым-жа ходам, ракачком... з набітымі кішэнямі.

У аднаго з іх у руцэ насьценны загарак. Пашто ўзяў ён яго? Адказаць-бы ня мог. Толькі, вылезшы з акна, ён зразумеў, што непатрэбен загарак яму. Шпурнуў на сярэдзіну вуліцы... Калёсікі, спрунжынкі, аправа—усё разьляцелася пылам...

А тут-жа побач «Малочны гандаль»... Зазьвінела шкло. Уварвалася жаўнераў шэсьць у магазын. На паліцах—галяндэрскі сыр. Пачалі хапаць. Кожны па некалькі галовак. Вынесьлі на вуліцу, пачалі прадаваць гарадзкой галоце. З якім асьцервяненьнем лаяліся жаўнеры, калі пры продажы

ўгледзелі, што некаторыя з галовак сыру акazаліся дравянымі формамі для выстаўкі ў вітрыну...

Скончыўшы «сваю справу» ў адным магазыне, жаўнеры пачынаюць шукаць новага, «цэлага» магазыну з той-жа мэтай—мэтай грабежніцтва.

Альбо яшчэ абразок. Едзе верхам на кані польскі жаўнер, перад ім досыць значная скрыня з папяросамі. Едзе, бярэ прыгаршчу папярос, ды сее іх па вуліцы навотмаш. Забаўляецца...

І вось у такіх абставінах, з тым, каб ня даць адыходзячаму на Менск ворагу затрымацца на загадзя падрыхтаванай позыцыі, т. Вітаўт Путна, камандзір 27-й дывізіі, парашыў, ня гледзячы на некаторае высунутае становішча дывізіі ў адносінах да суседніх частак і адсутнасьць дырэктыў камандуючага XVІ-й арміяй, атакаваць палякаў адразу.

З вёскі Студзенка, у якой знаходзіўся штаб дывізіі, аддаецца загад:

«З прычыны адсутнасьці сувязі за штабам арміі, каб ня даць ворагу затрымацца на загадзя падрыхтаванай позыцыі, я, у выкананьне пастаўленай перад арміяй задачы, парашыў аўладаць Менскім вузлом, дзеля чаго: комбрыгу 80 працягваць рашучае наступленьне, дзейнічаючы двумя палкамі абходам з Паўночна-ўсходняга кірунку, адным весьці фронтальнае наступленьне, аўладаць Менскам і да вечара 11 ліпеня выйсьці на лінію Крупкі—Новы Двор—рэчка Пціч—Панскі Двор Алесьцін (выключ.); комбрыгу 81—весьці імкнёнае

наступленьне, дзейнічаючы двума палкамі на Менск з Паўднёва-ўсходняга кірунку, адным палком перахапіць чыгуначны шлях Менск—Бабруйск і заняць да вечара лінію: панскі двор Алесьцін — Самахвалавічы. 27-ы кавалерыйскі полк—у маім распараджэньні, у непасрэднай блізкасьці перадавых частак на вучастку 81-й брыгады. Разьмежавальныя лініі паміж 80 і 81-й брыгадамі: м. Сьціклеў—станцыя Менск—панскі двор Алесьцін,—усё для 81-й брыгады ўключна».

І вось, паводле гэтага загаду комдыва, Чырвоная армія пачала наступленьне.

Крывавае полымя пажару заірдзелася ва ўсіх кутках Менску ноччу з 10 на 11 ліпеня. Падпалены белапалякамі вакзалы. Гарыць Серабранка, гарыць Залатая Горка, Камароўка, Пярэспа, Кальварыйскі разьезд. Шугае полымя пажару і ў цэнтры гораду. У горадзе сьпякота. Паветра перапоўнена пахам гары. У горадзе ня сьціхаюць стрэлы францускіх карабінаў. Гэта легіёны пацяшаюцца ў апошні раз. Пажары асьвятляюць начную цемру над горадам. Куды вокам ня кінь — пажары. Надыходзіць раніца...

— Нельга было, аўладаючы чыгуначным вузлом Менску, пакідаць самы горад бяз увагі дывізіі,— піша Вітаўт Путна,—бо тым самым можна было даць магчымасьць палякам выйграць час.

І вось на сьвітаньні 11 ліпеня брыгады пачалі дзейства па-майму, раней выданаму і ня зьмененаму загаду, бо абставіны да моманту атрыманьня

загаду камандарма не зьмяніліся: галоўныя часткі 17-ай дывізыі яшчэ не падышлі,—зазначае Вітаўт Путна.

Раніца. Перастрэлка чутна ў Менску. Чырвонаармейскія часьці ў напрамку Камароўкі. Палякі ў акопах. Дружная атака. Палякі ўцякаюць па чыстым полі. Бягуць да рэчкі. Кідаюцца ў ваду. Бальшавіцкае «ура» чутно на ваколічных вуліцах Менску. Бальшавікі наступаюць па пятах легіянэраў. Легіянэры адстрэльваюцца. Нанава атака. Павет-ра прарэзвае польская шрапнэль. Кучка чырвонаармейцаў зьнікае ў пыле, паднятым шрапнэльлю. Ад чырвонаармейцаў—шматкі цёплага мяса. Іншыя наступаюць. Лязгоча кулямёт. Сьвішчуць кулі. Гам. У горадзе курэюць пажарышчы. Усходняя частка Менску занята чырвонаармейскімі часткамі. А вакзалы...

Ня гледзячы на вялікае супраціўленьне, палякі былі выбіты з акопаў, панесьлі значную страту людзьмі і ўзбраеньнем і пачалі сьпешны і беспарадачны адыход, прымушана асяродкуючыся ў горадзе, бо на поўдзень і на поўнач перапраў на рэчцы няма. У 11 гадзін 30 хвілін аб'яднаныя каманды конных разьведчыкаў 238 Бранскага і 239 Курскага палкоў уварваліся ў горад, уносячы поўнае расстройства ў праходзячыя праз горад і яго ваколіцы польскія часткі. У 12 гадзін 241 Сялянскі і 242 Волжскі палкі, разьбіўшы палякаў у раёне станцыі Менск, сваімі часткамі ўступілі ў горад з поўдню. Па тракце ў напрамку на мястэчка Койда-

нава, уцякаючых палякаў прасьледваў кавалерыйскі полк дывізыі,—піша Вітаўт Путна.

А гэта значыць, што і вакзалы ў 12 гадзін дня 11 ліпеня 1920 г. былі ў Чырвонай арміі.

Па Менску няспынна з вінтоўкамі лётаюць партызаны. Там-сям запаздалы легіянэр. Палякі аддалі вакзалы, падпаліўшы пакгаўзы (чыгуначныя склады). Гар амэрыканскага сала, паленага шаўро, хрому, пшаніцы, грэцкіх круп, кавы, цукру, курэючыя пажарышчы ўсё разам узятае стварае нявыносную атмосфэру ў зруйнаваным дашчэнту белапалякамі Менску.

Да 14 гадзін горад быў канчаткова ачышчаны ад ворага,—піша Вітаўт Путна. У 16 гадзін у Менск прышлі часткі галоўнай брыгады 17-ай стралковай дывізыі. Прасьледуючы палякаў, часткі 27-ай дывізыі к канцу дня сталі на лініі ўжо ў 8—10 кілёмэтрах на захад і паўднёвы-захад ад Менску. Штаб дывізыі прыехаў у Менск у 19 гадзін. У выніку дзеннага бою 27-ая дывізыя ўзяла ў палякаў: 6 лёгкіх гармат, 32 кулямёты, ня ўстаноўленую тады дакладна колькасьць вінтовак, патронаў і звыш 300 палонных. Страты дывізыі забітымі і параненымі—320 чал.

...Карыстаючыся такой перагародай, як рэчка Нёман, палякі прабавалі ўсімі сіламі супраціўляцца. Але іх адпор на Нёмане без вялікіх цяжкасьцяй быў асілены і к канцу дня 16 ліпеня мы занялі рубеж рэчкі Вуша, а к поўдню 17-га вышлі да Баранавіцкай сыстэмы ўзмацнёных пазыцый на

вучастку Пенчына—Панскі двор Тарчыцы. Увесь шлях адыходу палякоў ад Менску да старых нямецкіх акопаў на рэчцы Сэрвач,—піша далей у сваёй кнізе Вітаўт Путна,—быў засыпаны кінутай вайсковай маёмасьцю, агняпрыладамі і ламаным абозам. Відавочны былі ўсе адзнакі сьпешнага і беспарадачнага адыходу. Ня гледзячы на гэта, палякі, адыходзячы, усё-ж не забываліся псаваць розныя дзяржаўныя пабудовы, якія мелі значэньне для наладжваньня транспорту: узарвалі чыгуначны мост на ваколіцы Менску, спалілі некалькі кварталаў гораду, выпалілі добрую палову мястэчка Койданава, станцыю Негарэлае, частку мястэчка Столбцы і ўзарвалі чыгуначны мост праз Нёман.

Так была вызвалена ад белапалякаў Савецкая Беларусь.

Прышоў чырвонаармеец змучаны, галодны, часткай бяз ботаў. Працоўныя масы Савецкай Беларусі не абсыпалі яго кветкамі, а стараліся знайсьці для яго ў хаце кавалак хлеба. Пакойна, бадзёра, бяз шуму, бяз гвалтаў ішоў ён за працоўныя масы і разам з працоўнымі масамі Беларусі. Ішоў ён на Варшаву.

## Вызваленая Беларусь

Гэй, за намі бедната!
(*М. Чарот.* „Босыя на вогнішчы").

Перад вызваленьнем Менску—сталіцы Беларусі, перад вызваленьнем усяе Савецкае Беларусі ад белапольскай окупацыі, Цэнтральны Камітэт Комуністычнай партыі Літвы і Беларусі разам з ваенным камандваньнем Заходняга фронту вылучыў Ваенна-Рэволюцыйны камітэт.

У склад ваенна-рэволюцыйнага камітэту ўвайшлі таварышы: В. Кнорын, А. Чарвякоў, Я. Адамовіч.

Пачаўся новы этап гісторыі Савецкай Беларусі.

1-га жніўня абвяшчаецца дэклярацыя, якая гаворыць:

— Многапакутная, змучаная Беларусь, краіна беларускіх, расійскіх, польскіх і яўрэйскіх рабочых і сялян, пры дапамозе гераічнай Расійскай Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі, завяршае справу свайго вызваленьня. Чырвоныя войскі, разьбіваючы апошнія рэшткі шляхецкіх армій, падыходзяць да Заходніх этнографічных граніц Беларусі. Рабоча-сялянскі народ Беларусі цяпер можа свабодна пра-

віць сваю волю і сам вызначыць свой лёс, формы свайго далейшага існаваньня, і свае ўзаемныя адносіны з суседзямі.

Организаваная рабочая кляса і працоўнае сялянства Беларусі, грунтуючыся на волі працоўных гушчаў, праяўленай на Першым зьезьдзе саветаў Беларусі ў лютым 1919 году, і шэрагу рэзолюцый і пастаноў павятовых савецкіх зьездаў рабочых і сялянскіх партый у поўнай згодзе з Чырвонай арміяй і Рэволюцыйным Ваенным Саветам Заходняга фронту.

**Імем паўстаўшых рабочых і сялян абвяшчае незалежную Социялістычную Савецкую Рэспубліку Беларусі.**

**... Усе законы і пастановы польскай окупацыйнай улады аб узнаўленьні прыватнай уласнасьці ў Беларусі касуюцца.**

— Яшчэ раз пацьвярджаецца, што права прыватнай уласнасьці на зямлю касуецца назаўсёды.

— Усе народныя багацьці пераходзяць у рукі дзяржаўных органаў рабоча-сялянскага народу.

— Беларуская «найвышэйшая рада» і ўсе белагвардзейскія і буржуазна-памешчыцкія ўрады Беларусі абвяшчаюцца ў дэклярацыі скінутымі і падлеглымі суду... усе ўрадавыя і клясавыя буржуазна-памешчыцкія ўстановы польскае окупацыйнае ўлады падлягаюць безадкладнаму затрыманьню і перадаваньню суду ваенна-рэволюцыйнага трыбуналу.

**— Социялістычная Савецкая Рэспубліка Беларусі будуецца на прынцыпах бязьлітаснай дыктатуры**

**пролетарыяту і выкарыстаньня ўсяе практыкі з Савецкай Расіі.**

— Социялістычная Савецкая Рэспубліка Беларусі будзе будаваць сваё жыцьцё на асновах прыцягненьня да савецкага будаўніцтва самых шырокіх працоўных мас, незалежна ад таго да якой нацыянальнасьці і вызнаньня яны належаць.

Гэтыя поўныя закліку і веры ў перамогу бадзёрыя словы дэкларацыі працоўных Савецкай Беларусі зьявіліся пацьвярджэньнем у другі раз незалежнасьці Савецкай Беларусі, пацьвердзілі дыктатуру пролетарыяту ў нашай краіне, у цесным саюзе з бядняцка-серадняцкімі масамі сялянства.

З гэтага часу на Беларусі пачалося савецкае будаўніцтва. З гэтага часу Менск стаўся Чырвонай сталіцай. Але змаганьне за Савецкую Беларусь яшчэ было далёка ня скончана. Фронт польска-савецкай вайны рэзаў цела Беларусі, ішла барацьба.

У кастрычніку 1920 году азвярэлая белапольская армія зноў захапляе Чырвоны Менск у свае рукі. Але лёс Чырвонай сталіцы Беларусі быў вырашаны бойкамі пад Койданавым. Гэтыя бойкі, праведзены Чырвонай арміяй у няспрыяючых умовах, каштавалі 27-ай дывізыі 3500 чырвонаармейцаў, ня менш загінула і легіянэраў, аднак, гэтыя бойкі пад Койданавым далі выйгрыш Чырвонай арміі і выратавалі для Савецкай Беларусі яе сталіцу. У гэтыя часы пачаліся мірныя перамовы і белапалякі былі вымушаны пакінуць Менск паводле ўмоў перамір'я. Менск застаўся савецкім.

Адразу пасьля вызваленьня Беларусі савецкая ўлада пачала залечваць раны на целе краіны. А ран было багата. На месцы спаленых станцый прышлося будаваць новыя вакзалы, ўзьнімаць жалезныя перакладзіны, аднаўляць жалезны мост у Менску на Савецкай вуліцы, што быў узарваны белапалякамі. На месцы спаленых пакгаузаў прышлося будаваць новыя пакгаузы, на месцы спаленага паравога млыну вырас новы паравы млын. На руінах запалкавай фабрыкі ўзьнікла дзяржаўная фабрыка абутку. На руінах абойнай фабрыкі Эпштэйна вырасла дзяржаўная абойная фабрыка. На месцы зьнявечанага, закінутага заводу Сальмана вырас «Комунар». Нарадзілася фабрыка Меншвэй. На месцы выпаленага белапалякамі кварталу на Траецкай гары вырасьлі смалістыя двухпавярховыя дамы рабочых пасёлкаў. Абудзіліся дрожджавыя заводы, загулі трансмісіі, закруціліся барабаны ў чопах менскіх гарбарань, загуў мэталюргічны завод «Энэргія», дала энэргію, ваду і сьвет гораду пераабсталяваная менская электрычная станцыя. Санітарна-гігіенічныя ўмовы ў Менску амаль-што да апошняга часу былі надзвычай дрэнныя. І толькі цяпер Менск у праве гардзіцца правядзеньнем каналізацыі гораду. Мэханізаваны хлебазавод, які прышоў на зьмену соткам хлебапякарняў з антыгігіенічнымі ўмовамі, завод «Дрэвапрацоўшчык», які прышоў на зьмену соткам менскіх саматужнікаў, новы гарбарны завод «Бальшавік», фабрыка галянтарэі «Беларуска», дзесяткі

працоўных колектываў і арцеляй мэталістых, шаўцоў, краўцоў, панчошніц, ткачоў, дрэваапрацоўшчыкаў, шчотачнікаў, рымароў,—усё гэта падводзіць пад Менск новую грунтоўную экономічную базу, якой няма параўнаньня ў мінулым Менску.

Калі ўзяць 500 рабочых Менску апошніх гадоў XIX стагодзьдзя і параўнаць іх з дваццацітысячным пролетарыятам сталіцы сёньня розьніца будзе надзвычай вялікая... Беларусь сёньня мае шэраг вышэйшых навучальных і культурных установ, якіх да вызваленьня ў нас ня было.

Беларускі дзяржаўны ўнівэрсытэт заснаваны ў Менску толькі ў 1921 г., цяпер зьяўляецца адным з буйных культурна-політычных цэнтраў, які выпускае спэцыялістых па розных галінах нашай гаспадаркі і культуры. Настаўніцтва, інжынэры, дактары, юрысты, экономістыя выходзяць з яго сьцен.

Заснованая ў 1929 г. Беларуская акадэмія навук (раней інстытут беларускай культуры), зьяўляецца цэнтрам навуковай думкі Беларусі.

Беларускі навукова-дасьледчы інстытут сельскай і лясной гаспадаркі імя Леніна, які праводзіць навукова-дасьледчую працу, зьяўляецца таксама адным з буйных навуковых цэнтраў.

Менск зьяўляецца цэнтрам партыйнай асьветы ў Беларусі, у Менску працуе комуністычны унівэрсытэт імя Леніна, у заданьні якога ўваходзіць падрыхтоўка партыйных работнікаў.

Менск зьяўляецца таксама і цэнтрам літаратурнага жыцьця Савецкай Беларусі. У Менску знахо-

дзяцца тры пісьменіцкія організацыі (БелАПП, «Узвышша», «Полымя»), якія яднаюцца і праводзяць сваю ляборатарную працу ў Доме пісьменьніка.

У Менску знаходзіцца і таварыства ваяўнічых марксыстых—цэнтр марксыцкай думкі на Беларусі.

Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва, дзесяткі рэдакцый газэт, тэатры. Організацыі рэволюцыйных мастакоў—усё гэта дапаўняе культурнае жыцьцё сталіцы Беларусі.

Неабходна зазначыць на існаваньне ў Менску Беларускага дзяржаўнага музэю з шматлікімі аддзеламі, Музэю рэволюцыі, Беларускай дзяржаўнай бібліотэкі, якая налічвае каля паўмільёна тамоў кніг, гістарычнага архіву і архіву Кастрычнікавай рэволюцыі.

■

Сёньня ў Менску ў кожным поступе, у кожным руху чуецца магутнае, новае соцыялістычнае будаўніцтва. Пабудова новага трамваю, пабудова унівэрсытэцкага гарадку, пабудова будынку беларускай дзяржаўнай бібліотэкі, будаўніцтва Дому ўраду, кватэрнае будаўніцтва, будаўніцтва I усебеларускай выстаўкі сельскай гаспадаркі і прамысловасьці—усё гэта дапаўняе вобраз сталіцы Беларусі—Менску ў часы соцыялістычнай рэконструкцыі.

Сёньня ў Менску страшэнна многа пылу. Рыпеньне пілаванага жалеза, стук малаткоў і кельняў, лязг цэглы і шыпеньне толькі што пагашанай вап-

ны, рыштаваньні на кожнай амаль вуліцы малюе вам будаўніцтва новага гораду, новай сталіцы, непадобнай на старажытны Менск з вузкімі Завальнымі і Замкавымі вуліцамі, непадобна на Менск губэрскі горад. Вырастаюць чатырох, шасьціпавярховыя камяніцы, вырастаюць фабрыкі і заводы, пабудаваныя на прынцыпе навейшай тэхнікі.

Шырокімі прасторнымі вуліцамі з новымі садамі, з прыгожымі будынкамі, з добра абсталяванымі фабрыкамі, заводамі і ўстановамі мы ўяўляем будучы Менск.

А Менск—гэта вобраз усёй Савецкай Беларусі.

Рабочая кляса, у саюзе з бядняцка-серадняцкім сялянствам будуе будучыню сваёй краіны.

■

Сьвята 11 ліпеня—дзень вызваленьня сталіцы Савецкай Беларусі ад белапалякаў, дзень вызваленьня сталіцы Беларусі—Менску—зьяўляецца сьвятам усіх працоўных нашай рэспублікі. Значэньне гэтага сьвята ў тым, што з 11 ліпеня 1920 году працоўныя Савецкай Беларусі пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі самі, пазбавіўшыся ў вялікіх клясавых боях ад буржуазіі і окупантаў, пры дапамозе магутнага Савецкага Саюзу рэспублік будуюць сваё жыцьцё.

У дзесятыя ўгодкі сьвяткаваньня 11 ліпеня мы павінны ўлічваць і тое, што цяпер, як ніколі, сусьветная буржуазія з зайздрасьцю глядзіць на Савецкі Саюз, павінны памятаць аб тым, што фашыц-

кая Польшча ўвесь час і асабліва цяпер зноў працягвае рукі на нашу рэспубліку.

Гэта абавязвае нас дзень сьвяткаваньня 11 ліпеня ператварыць у дзень нашай баявой падрыхтаванасьці, падрыхтаванасьці да абароны межаў Савецкай Беларусі так, як працоўныя Савецкай Беларусі пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі баранілі свой край у 1920 годзе.



19574

## Выкарыстаная літаратура


1. *Витовт Путна.*—К Висле и обратно. Военный вестник. Москва, 1927.
2. *Ус. Ігнатоўскі.*—Вялікі Кастрычнік на Беларусі. „Беларусь". Менск, 1924.
3. *Майзэль і Шапавалаў.*—Кароткі нарыс гісторыі КП(б)Б. Белдзяржвыдавецтва. Менск, 1929.
4. *Олікер і Розэнблюм.*—Нарысы па гісторыі комсамолу Беларусі. Белдзяржвыдавецтва. Менск, 1927.
5. *Іл. Барашка.*—Шлях змаганьня і перамог. Белдзяржвыдавецтва. Менск, 1928.
6. *Іл. Барашка.* — Ліпнёвыя дні (успаміны) з зборніку „У прасторы". Выданьне „Маладняка", 1926.
7. *А. Чарвякоў.*—Успаміны. Часопіс „Малады Араты". Менск, 1926.
8. *П. Ляўкоў.*—Напярэдадні вызваленьня—газ. „Сав. Беларусь".

ЦАНА 6 кап.

10 к.

Бел. аддзел
1994 г.

B0000004033754